Як толькі дачулася насельніцтва, што пункт адчынен і што назначан свой чалавек—Пятрок Смычок, дык хто пашоў, а хто паехаў да яго палячыцца. Прышоўшы ў Бялічаны, пачулі, што фэльчар быў, але пашоў дамоў у Жарамен, гэтак ён штодзень робіць, бо, бачыце-ж, трэба яму паглядзець, як яго жонка сьвіньняў дагляджала, ці добра, ці дрэнна, а ты хворы, што дарма 6 вёрст праехаў, сядзі і чакай. Дрэнна яшчэ і тое, што да гэтага часу дакартва ня прыслалі ў Бялічаны, але гэта для фэльчара лепш, бо ён мае адказ: «Чаго я буду тут сядзець, калі лякарства няма». Апрача таго, ён як старэй прыватнік, мае некаторыя свае лякарствы, дык калі хто прыедзе ці прыдзе да яго ў яго ўласнае памяшканьне, дык трэба заплаціць бо ён кажа, што свайго ўласнага лякарства бяз грошай не даю.

І гэта яшчэ нічога, але вось калі чалавек захварэе раптам і трэба яго весьці, ці фэльчара выклікаць, дык ня ведаеш, што рабіць, ці шукаць яго дома, ці на мэдпункце. Трэба на гэта зьвярнішча зьвярнуць увагу органаў аховы здароўя.

Пацыент.

На сродкі самаабкладаньня пабудаваны новыя масты і грэблі.

Клічаў. У Кабылянскім сельсавеце ў маі месяцы г. г. сяляне вёскі Кабылянкі правялі самаабкладаньне на пабудову маста і грэблі на дарозе Кабылянка—Арэхаўка на балоце. Раней праз гэтае балота нельга было праехаць, прыходзілася аб'яжджаць праз вёску Чаравач і даваць круг на 5 кіл. Кабылянцам таксама нельга было праехаць на сваё поле праз балота.

Доўгі час сяляне гутарылі, каму будаваць гэтую грэблю і мост,—ніхто не згаджаўся, бо грэбля вельмі даўгая, мае ў даўжыню 0,6 кіл. і мост на 7 пагонных мэтраў. І толькі з правядзеньнем закону аб самаабкладаньні, сяляне, як адзін, ахвотна і з зацікаўленасьцю распачалі будаваць мост і грэблю. Працавалі без перапынку 2 тыдні. Цяпер праца скончана, грэбля ўзьнята на 1,6 мэтраў вышэй, шырокая, абкладзена дзёрнам, пабудован новы мост на 7 пагонных мэтраў.

Не адсталі ад кабылянцаў вёскі Казлы і Градкі, якія па прыкладу кабылянцаў правялі самаабкладаньне на пабудову грэблі і маста на лузе на дарозе Кабылянка — Казлы — Градкі. Працу ў дзесяцідзённы тэрмін скончылі, пабудавалі грэблю даўжынёю ў 0,3 кіл. і мост з прыладамі на 5 пагонных мэтраў.

Калі-б паллічыць каштоўнасьць гэтых 2-х грэбель і мастоў, то выйдзе ня менш 3000 рублёў.

Цяпер чарга за грэбляй на рэчцы „Несята" па дарозе Кабылянка—Асінаўка, якую патрэбна адрамантаваць Уладзімераўскаму і Максімаўскаму сельсаветам, бо Кабылянскі сельсавет і тут сваю частку зрабіў. **Паўлоўскі.**

Кватэрнае будаўніцтва.

Магілеў, 30-VII. У гэтым годзе на кватэрнае будаўніцтва па гораду адпушчана 50.000 рублёў.

У першую чаргу пад кватэры аднаўляюцца камяніцы, якія сталі разбуранымі з часу грамадзянскае вайны.

На сёнешні дзень амаль што адрамантаваны 2 дамы, у якіх будзе разьмешчана 12 сямей.

У будучым годзе намечана адрамантаваць 42 кватэры.

ЧАРГОВЫЯ ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАДАЧЫ Ў РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ.
Трэба ажывіць камісіі садзейнічаньня. — У кампаніі па рэалізацыі пазыкі павінны прыняць удзел прафактыў і рабселькоры.

(Гутарка з начальнікам валютнага кіраўніцтва НКФ БССР т. Гальперыным).

Фактычная падпіска і кампанія рэалізацыі 2-й пазыкі індустрыялізацыі распачнецца з першага верасьня і павінна быць скончана ў працягу двох месяцаў. Гэтыя абставіны, а таксама і тое, што сума выпускаемай пазыкі вельмі значная, патрабуюць надзвычайнага напружаньня сіл, патрабуюць дакладнай пастаноўкі агітацыйнай і арганізацыйнай працы.

Як нам вядома, пры рэалізацыі 1-й пазыкі індустрыялізацыі па ўсіх прадпрыёмствах і ўстановах былі ўтвораны камісіі садзейнічаньня. Пасьля скончэньня кампаніі гэтыя камісіі вельмі слаба працавалі, а ў шмат выпадках і зусім замёрлі.

Першая арганізацыйная задача будзе стаяць у тым, каб арганізаваць камісіі садзейнічаньня рэалізацыі пазыкі там, дзе іх няма, і ажывіць працу тых, якія яшчэ захаваліся. Склад камісій павінен быць дзелавы і аўтарытэтны, бо ад працы гэтых камісій у значнай меры будзе залежаць посьпех усёй кампаніі. Камісіі садзейнічаньня павінны быць арганізаваны па ўсіх прадпрыёмствах, установах, жактах і г. д.

Гэтыя камісіі павінны наладзіць самую шчыльную сувязь з фінансавымі органамі для атрыманьня неабходных матар'ялаў, інструкцый і г. д.

Нашым фінансавым органам прыдзецца склікаць райённыя і агульнагарадзкія канфэрэнцыі сьвяроў камісій садзейнічаньня для абгаварэньня пытаньняў рэалізацыі пазыкі і наогул пытаньняў дзяржаўнага крэдыту.

У працу па разьмяшчэньні 2-й пазыкі індустрыялізацыі павінен быць уцягнуты ўвесь прафсаюзны актыў.

Значную ролю ў кампаніі па рэалізацыі пазыкі павінна адыграць і наша прэса, значэньне якой пры правядзеньні кампаніі па рэалізацыі 1-й пазыкі індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі было агромадным. Прэса павінна дапамагаць мабілізацыі грамадзкіх сіл навокал пытаньня рэалізацыі пазыкі і весьці шырокую растлумачальную кампанію як аб мэтах пазыкі, так і аб парадку яе разьмяшчэньня.

У працу па рэалізацыі 2-й пазыкі індустрыялізацыі неабходна ўцягнуць таксама ўсю масу рабкораў і сялькораў, якія могуць і павінны стаць папулярызатарамі пазыкі на мясцох. Было-б пажадана і карысна наладжваць агульныя сходы рабсялькораў для растлумачэньня палітыкі дзяржаўных пазык.

У часе кампаніі рэалізацыі павінны вялікую ролю адыграць і насьценгазэты на прадпрыёмствах, у хатахчытальнях, сельсаветах і г. д.

Асабліва шырокая растлумачальная кампанія павінна весьціся ў вёсцы, дзе ў часе рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі былі дапушчаны некаторыя шурпатасьці і нерагібы. Новая кампанія павінна весьціся на прынцыпе поўнай дабраахвотнасьці разьмяшчэньня пазыкі і павінны быць расьселяны тыя настроі, якія ў некаторых мясцох утварыліся пры рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі.

Сума новай пазыкі куды большая за суму 1-ай пазыкі індустрыялізацыі, і каб забясьпечыць дзяржаве прыток неабходных сродкаў, трэба будзе ўсімі сіламі імкнуцца да таго, каб усе 100 проц. рабочых на прадпрыёмствах і служачых ва ўстановах падпісаліся на пазыку ў разьмеры іх месячнага заработку.

Рабочыя, сяляне і служачыя павінны памятаць, што, прымаючы актыўны ўдзел у рэалізацыі 2-й пазыкі індустрыялізацыі, яны тым самым стануць актыўнымі ўдзельнікамі сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

Рабочыя вітаюць выпуск II пазыкі індустрыялізацыі

Гомель, 31-7. Гомельскія рабочыя вітаюць выпуск 2-е пазыкі індустрыялізацыі. Рабочыя заяўляюць, што яны ахвотна надпішуцца на аблігацыі пазыкі, бо пазыка дае пэўную выгоду. На заводзе «Пролетарий» многія рабочыя, дзякуючы аблігацыі пазыкі, зьберагліі некаторыя сумы. Рабочыя заводу зьвярнуліся ў завком з прапановаю распачаць растлумачваючую працу.

Рабочыя фабрыкі «Труд» прапануюць пачаць падпіску на аблігацыі пазыкі. Акрфінаддзел у бліжэйшы час распачынае практычную працу па рэалізацыі пазыкі. У акрузе будзе заснавана акруговая камісія дапамогі пазыцы. На прадпрыёмствах і ў райёнах будуць арганізаваны аналёгічныя камісіі. Намячаецца арганізацыя конкўрсу на лепшую камісію дапамогі. Учора ў Дзяржбанку некаторыя асобы наводзілі спраўкі аб умовах рэалізацыі пазыкі. Дзяржбанк пачаў папярэдні запіс на пакупку аблігацый.

Сяляне, страхуйце сваю рухомую маемасьць!

Наша сялянства досыць добра знаёма з шэрагам відаў дзяржаўнага страхаваньня, і зусім зразумела, бо дзяржаўнае страхаваньне існуе ў нас амаль што сем гадоў.

За гэты перыяд аграмадная колькасьць сялянскіх гаспадарак ужо атрымала тую ці іншую дапамогу ад органаў дзяржаўнага страхаваньня. Разьмер дапамогі, якую атрымоўваў селянін, залежыў ад самаго селяніна, бо калі ён абмяжоўваўся адным акладным страхаваньнем, дык страхавая дапамога была меншай. У тых-жа выпадках, калі гаспадар страхаваў сваю маемасьць яшчэ дадаткова, дык і дапамога Дзяржстраху была больш значная.

Разам з тым трэба адзначыць, што ў сялянскай гаспадарцы ёсьць і такая маемасьць, якая зусім не страхуецца ў акладным парадку. Да гэтай маемасьці адносіцца ўся хатняя рухомасьць як мэбля, вопратка, бялізна, абутак і і інш., так і сельска-гаспадарчы інвэнтар і нарэшце сельска-гаспадарчыя прадукты: хлеб у зярне, або ў саломе, сена, гародніна і шэраг іншых. Уся гэта маемасьць па прыблізных падліках каштуе ў сярэднім ня менш 600 руб. Такім чынам каштоўнасьць рухомай маемасьці сялянскай гаспадаркі часам адпаведнасьць ня менш кошту будынкаў. Між тым усе будынкі сялянскай гаспадаркі застрахаваны па акладным страхаваньні, а 10 пр. іх яшчэ і дадаткова. Рухомая-ж маемасьць і сельска-гаспадарчыя прадукты, як мы гаварылі вышэй, па акладным страхаваньні зусім не страхуюцца.

Дабраахвотнае-ж страхаваньне ў гэтай галіне ў большасьці акруг разьвіта яшчэ вельмі слаба. Е прыкладу ў Полаччыне ў 26-27 годзе было 42 страхаваньня, у Віцебшчыне—96, Аршаншчыне—375 і ў Мазыршчыне толькі 10 страхаваньняў. Крыху больш гэты від страхаваньня распаўсюджаны ў Гомельшчыне, Магілеўшчыне і Меншчыне. Параўнальна здавальняюча стаіць справа з страхаваньнем рухомай маёмасьці ў Бабруйскай акрузе, дзе летась было зарэгістравана звыш 9400 страхаваньняў гэтага віду. Прыблізна гэткі-ж малюнак з страхаваньнем рухомай маемасьці і сельска-гаспадарчых прадуктаў мы назіраем па акругах Беларусі і сёлета.

Водгук даных Белдзяржстраху нагогул па Савецкай Беларусі з 100 гаспадарак 98 зусім не застрахавалі сваей рухомай маемасьці на выпадак пажару, а калі-ж разглядаць паасобныя акругі, дык небясьпека ў гэтай галіне будзе яшчэ большай.

Відаць, што ня ўсё сялянства ведае аб тым, што можна страхаваць рухомую маемасьць, але побач з гэтым трэба адзначыць, што досыць ёсьць такіх гаспадароў, якія спадзяюцца на тое, як-небудзь яно будзе, а можа пажару і ня будзе, а навошта, маў, тады страхаваць.

Наш вясковы актыў павінен растлумачыць селяніну, што спадзяванца на «авось», гэта значыць ставіць сваю гаспадарку пад нагрозу магчымага разбурэньня. У сучасны момант агенты Дзяржстраху на мясцох праводзяць працу па пераацэнцы будынкаў у шмат якіх вёсках. Агенты павіны побач з правадзімай працай растлумачыць селяніну карысьць ад гэтага віду страхаваньня.

Як ня трэба распаўсюджваць газэт
(Слуцкае паштовае аддзяленьне)

Лёзунг—«Газэта і кніга—у вёску»—выконваецца Слуцкай поштай адвартна. Прыклад, калі вясковыя хлапцы захацелі выпісаць газэту ў такую вёску, дзе ні адзін экзэмпляр газэты да гэтага часу ня выпісваўся, дык, прышоўшы на пошту і запытаўшыся,—тут выпісваюць газэты,—пачулі адказ, —тут, але пачакайце. Вы падумаеце, што асоба, якая сядзела па выпісцы газэт, была занята якімі небудзь справамі? Мыляецеся—ён паіў у той час нейкіх дам часам. Хлопцы пачалі думаць, што папалі ў чайную, але на вывесцы было напісана—пошта.

Стаім і думаем, але к гэтаму часу дзеці і дамы былі адпоены і паштавік умілаваслівіўся і выпісаў газэты. Здаволеныя ідуць хлопцы дадому.

Чакаюць газэт. І дачакалі: 9 ліпеня прыходзяць 2 нумары „Савецкая Беларусь" за 3 і 4 ліпеня, а „Беларускае Вёскі" няма, але выбачайце, я крыху схлусіў к «Сав. Бел.» быў дадатак, гэтая-ж газэта за 25 мая.

Маючы паштар на курэньне мне прыслаў, або пад блюдка падсьцілаць, як чай буду піць. Што-ж «Сав. Бел.» прачыталі, а «Бел. Вёска» кажам, нехай ляжыць на пошце разам атрымаем. Чакаем, ды цешымся, што цэлую бібліятэку атрымаем з газэт. Прышло 20 ліпеня—газэт няма. Пашоў на пошту спытацца чаму няма газэт. «Мы—адказваюць—даведаемся і скажам, а вы ня турбуйцеся, нікому вашыя газэты не патрэбны, разам атрымаеце. Ізноў цешымся. Гэта-ж газэтулькі адразу газэт, амаль за м-ц «С-Б» і ў цалку «Б-В». Але няспраўдзіў паштавік. 25 ліпеня ізноў атрымалі «Сав. Бел.» за 11, 18 і 21 ліпеня, а «Бел. Вёс.» за 7 і 11 ліпеня. Нахмурнелі мы.

Зараз 29 ліпеня, больш газэт не атрымоўваем. Сяляне як паглядзелі, як мы атрымоўваем газэты, дык съмяюцца, што грошы дарэмна аддалі.

І [illegible]каў.

ЗА БОЛЬШЫ УРАДЖАЙ.

Дзьве асноўныя задачы стаяць перад зямельнымі працаўнікамі і сялянствам у асеньнюю пасеўкампанію. Першай зьяўляецца калектывізацыя і арганізацыя розных вытворчых відаў сельска-гаспадарчай каапэрацыі і другая—барацьба за ўзьняцьце ўраджайнасьці.

За перыяд вясны намі арганізавана 388 новых калектыўных гаспадарак, але пакуль што ўсе яны знаходзяцца ў стадыі арганізацыі і пагэтаму ўвосень нам усю працу прыдзецца скандэнтраваць, галоўным чынам, на замацаваньні толькі што арганізаваных калектываў. Калі мы іх замацуем, то зробім вялікую справу, бо новыя калгасы зусім невялічкія як па ліку зямлі, так і па ліку сем'яў да гэтага часу не абсталяваны, гаспадарча не ўпарадкаваны. Усе гэтыя недарэчнасьці за перыяд восені неабходна ліквідаваць, каб замацаваць зробленыя дасягненьні. На калектыўнаму будаўніцтву галоўным недахопам у нашай працы зьяўляецца тое, што мы стараемся абы як толькі арганізаваць больш калгасаў, і пасьля гэтага зусім не клапоцімся аб іх гаспадарчым замацаваньні, у выніку чаго яны развальваюцца.

Што датычыцца спэцыяльных відаў сельска-гаспадарчай каапэрацыі, дык у гэтых адносінах плян выканан толькі на 66 процантаў і ў даным напрамку прыдзецца шмат папрацаваць, каб дадзеныя дырэктывы выканаць і пашырыць вытворчае сялянскае каапэраваньне.

У сьвятнім годзе да гэтага часу абсалютна нічога ня зроблена на арганізацыі насяльковых каапэратываў. Цяпер палажэньне і статут аб гэтых пасёлках зацьверджаны, і кожны райён павінен у працягу восені арганізаваць пасяльковыя каапэратывы.

У мінулыя гады мы амаль зусім не праводзілі ўвосень спэцыяльнай пасеўкампаніі і не мабілізоўвалі сялянскую актыўнасьць каля задач асеньняга севу. Аднак, пара прызнацца, што ў гэтым мы рабілі памылку, бо вытворчасьць збожжавых культур і ва ўмовах Беларусі зьяўляецца аднэй з важнейшых задач. Пры тым курсе на шпаркую інтэнсыфікацыю сельскае гаспадаркі, які мы праводзім, мы разам з гэтым ставім перад сабой задачу дабіцца такіх ураджаяў па збожжавых культурах, каб яны цалкам забясьпечвалі краіну хлебам без завозу яго з пазамежаў Беларусі. Некаторым такая наша ўстаноўка можа паказацца, што мы гэтым самым радыкальна мяняем курс нашае сельска-гаспадарчае палітыкі і заместа інтэнсыфікацыю сельскае гаспадаркі, які мы праводзім, мы разам з гэтым ставім перад сабой задачу дабіцца такіх ураджаяў па збожжавых культурах, каб яны цалкам забясьпечвалі краіну хлебам без завозу яго з пазамежаў Беларусі. Некаторым такая наша ўстаноўка можа паказацца, што мы гэтым самым радыкальна мяняем курс нашае сельска-гаспадарчае палітыкі і заместа інтэнсыфікацыю сельскае гаспадаркі, якую

Патроім ураджайнасьць нашых палеткаў

АБ ПАВЯЛІЧЭНЬНІ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ Ў БССР

(З дыспуту ЦСПСБ).

Падняцьце ўраджайнасьці нашай сельскай гаспадаркі павінна стаць цэнтрам увагі ня толькі спэцыялістаў, але ўсіх працоўных. —Вакол гэтага пытаньня трэба згрупаваць думку ўсёй савецкай грамадзянасьці.

На ініцыятыве ЦП саюзу сельскіх і лясных працаўнікоў 30-га ліпеня ў памяшканьні ЦСПСБ быў арганізаван дыспут на тэму аб павялічэньні ўраджайнасьці ў БССР.

У нарадзе прымалі ўдзел: Наркамземляробства т. Прышчэпаў, намесьнік Наркамземляробства т. Каровікаў, дырэктар Беларускага Дасьледчага Інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі т. Гарэцкі, шмат выдатных спэцыялістаў і вучастковых аграномаў.

ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ РЫНАЧНАСЬЦІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БССР.

У добра абгрунтаванай прамове т. Гарэцкі абрысаваў сучасны стан ураджаяў беларускіх глеб і шляхі ўзмацненьня ўраджайнасьці ў будучыне.

— У параўнаньні з іншымі райёнамі СССР,—адзначыў т. Гарэцкі,—БССР зьяўляецца райёнам інтэнсыўнага вядзеньня сельскай гаспадаркі. Характэрнай асаблівасьцю гэтага райёну зьяўляецца ўстойлівы ўраджай, які надаецца найменшым гадавым хістаньням, найбольш незалежны ад клімятычных уплываў; цікава яшчэ і тое, што стан інтэнсыфікацыі цесна зьвязана з стабільнасьцю ўраджаю. Чым больш інтэнсыўны райён, тым больш устойліва сама ўраджайнасьць. Вось чаму ўсе мэрапрыёмствы, накіраваныя на павялічэньне ўраджайнасьці, павінны быць адначасна накіраваны і на павялічэньне інтэнсыфікацыі сельскай гаспадаркі.

Трэба адзначыць, што за апошнія 47 год вельмі стабільна становіцца нашых ураджаяў. У пасьляваенны час мы маем рэзкае зьніжэньне ўраджаю, асабліва па аўсу і ячменю, менш—па жыту.

Марудны тэмп росту ўраджайнасьці ў Беларусі тлумачыцца цэлым шэрагам прычын і ў першую чаргу—натуральнасьцю сельскай гаспадаркі.

Дзеля павышэньня ўраджайнасьці нам трэба дбаць аб максымальнай урбанізацыі (павялічэньне насельніцтва гарадоў за кошт вёскі), узмацненьні тэмпу індустрыялізацыі ў сэнсе ўтвараньня ўнутранага рынку; дабівацца ўсьмернага росквіту с.-г. калектываў; узмацніць тэмп мэліярацыі, сідэрацыі глебы, плянавага замацаваньня шматпадзёнага севазвароту і зьвяр-насельніцтва.

ШЛЯХ ДА ДОБРЫХ УРАДЖАЯЎБУЙНЫЯ ГАСПАДАРКІ.

Тав. Міхайлаў бачыць шлях да надвышэньня ўраджайнасьці праз арганізацыю буйных калектыўных гаспадарак. Прамоўца лічбовымі данымі даводзіць, што ў буйных гаспадарках ураджаі на Беларусі (у даваенны час і зараз) значна вышэйшыя, чым у дробных сялянскіх гаспадарках. Такім тыпам буйнай сельскай гаспадаркі зьяўляецца зараз с-г. калектыў, на арганізацыю якіх трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Другой мерай падвышэньня ўраджайнасьці зьяўляецца павялічэньне завозу ў БССР штучнага ўгнаеньня, якога зараз у нас бракуе.

— Арганізацыя с-г. калектываў, лубін, штучнае ўгнаеньне, розныя травы, ужываньне торфу, як угнаеньне—вось шляхі да павышэньня ўраджаю.

ВОПЫТЫ ДАСЬЛЕДЧЫХ СТАНЦЫЙ—Ў МАСЫ.

Загадчык Менскай расьлінаводнай станцыі т. Прохараў высоўвае, як неабходныя мэрапрыёмствы па падвышэньні ўраджайнасьці, увядзеньне ў Менска - Слуцкім райёне 4-х-палёвы севазварот, які даў-бы магчымасьць узбагаціць глебу арганічнымі і мінэральнымі спажыўнымі для расьлін рэчамі. Для гэтага нашы насеннаводныя станцыі павінны падабраць гатункі лубіну з больш кароткім вэгітацыйным пэрыядам, каб ён да пасеву жыта мог пасьпець на насеньне, і яго можна было зьбараць.

Менская расьлінаводная станцыя правядзіць наступны севазварот, які дае высокі эканамічны эфэкт: жнівіньча аўсу ці ячменю заворваецца, і на ім сеюць азімую віку, якая пасьпявае ў пачатку чэрвеня на другі год і дае да 300 п. з гэктару добрага сена. Адразу засяваюць на гэтым месцы лубін з дабаўленьнем фасфарыту, і да восені лубін дае шмат арганічнай масы; на ім засяваюць жыта. На трэці год па жніве з вясны засяваюць сарадэлю ці пасьля зьняцьця ўраджаю—лубін, якога ня трэба на зіму заворваць, а вясной, дабавіўшы трохі гною, можна сеяць бульбу. Галоўную масу гною ў гаспадарцы можна накіраваць на кораньплоды, а то і на бульбу; дзякуючы гэтаму ўраджай будзе гарантаваны.

Дыспут выклікаў вялікую зацікаўленасьць з боку спэцыялістаў, якіх сабралася на сход даволі многа.

Апрача выступленьня тых таварышоў, якія друкуюцца сёньня ў нашай газэце, выступалі: т. т. Савіцкі, Бонч-Асмалоўскі, Данілаў і Карчэўскі (апошнія два—вучастковыя аграномы).

Рыхтуемся да асеньняга севу.

КАЛГАСЫ ПЕРАД СЕВАМ.

У калгасах ужо разгарнулася шырокая падрыхтоўка да асеньняй пасеўнай кампаніі.

Усяго сёлета пад азімымі пасевамі у калгасах мае быць занята каля 10900 гэктараў зямлі.

Вялікая праца мае быць праведзена ў час асеньняй пасяўной кампаніі па арганізацыі шматпалёвых севазваротаў: апошняе мяркуецца ўвесьці ў 216 калгасах. Добры гатунак насеньня значна павялічвае ўраджайнасьць. Пагэтаму сёлета па пляну намячаецца распаўсюдзіць у калгасах 3000 цэнтнэраў гатунковага жыта, в якіх 1500 цэнтнэраў ужо накіравана для разьмеркаваньня па калгасах, а рэшту насеньня калгасы атрымаюць праз акруговыя зямельныя аддзелы.

Апроч таго, у асеньнюю пасеўную кампанію мае быць завезена ў калгасы каля 8700 цэнтнэраў штучнага ўгнаеньня.

Сельска-гаспадарчымі машынамі і прыладамі калгасы ў надыходзячую пасеўную кампанію будуць амаль-што поўнасьцю забясьпечаны.

Ачыстка і сартыроўка насеньня таксама значна дапамагаюць павялічэньню ўраджайнасьці, а таму ў асеньнюю пасеўную кампанію мае быць ачышчана і адсартавана насеньня па калгасах каля 100000 пудоў.

У некаторых райёнах пшаніца заражана галаўнёю. Гэткае насеньне ні ў якім разе немагчыма выкарыстоўваць для пасеву, без папароднага пратраўліваньня. Па пляну мяркуецца пратравіць каля 1500 пуд. насеньня пшаніцы. Райённай агранаміі неабходна аказаць у гэтым калгасам адпаведную тэхнічную дапамогу.

На правядзеньне асеньняй пасяўной кампаніі на калгасах Белсельсаюзам адпушчана 300000 руб. агульнага крэдыту і 50000 руб. спэцыяльных сродкаў, усяго—350000 руб., якія ўжо разьмеркаваны па акругах.

У часе асеньняга севу калгасы будуць таксама аказваць шырокую дапамогу бяднейшаму сялянству. Гэта дапамога будзе выяўляцца ў ачыстцы насеньня, абмене палепшанага насеньня і аказаніі дапамогі машынамі ў апрацоўцы і падрыхтоўцы глеб. Усяго мяркуецца ачысьціць бяднейшаму сялянству каля 400,000 кгр. насеньня, правесьці абмен 40000 кгр. насеньня і засеяць каля 150 гэктараў.

КАНТРАКТАЦЫЯ АЗІМІНЫ Ў МЕНСКАЙ АКРУЗЕ.

У Менскай акрузе будзе ўсяго закантрактавана 8.750 гэкт. азімін. Кантрактацыя будзе праводзіцца ў Чэрвенскім, Капыльскім, Смалявіцкім і Астрашыцка-Гарадоцкім райёнах.

АРГАНІЗАЦЫЯ НАСЕННАГА ФОНДУ.

Менскі акраз ўзьнімае пытаньне аб арганізацыі насеннага фонду сартавога насеньня на асеньнюю сяўбу. Дзеля гэтага мяркуецца забраніраваць у савгасах Менскай акругі ўсе лішкі жыта, якія павінны быць добра захаваны. Гэта дасьць магчымасьць у наступны год вольна рэгуляваць асеньняй сяўбой.

КАНТРАКТАЦЫЯ ЖЫТА Ў БАБРУЙШЧЫНЕ.

Бабруйск, 31-7. У працягу асеньняй сяўбы ў Бабруйшчыне будзе закантрактавана 12500 гэкт. жыта. Апрача авансу, засеўшчыкі будуць задавальняцца ў першую чаргу машынамі, насеньнем і ўгнаеньнем. Праца па кантрактацыі будзе закончана да 20-га жніўня.

Павялічэньне сродкаў на мэліярацыю.

Сродкі на мэліярацыю ў 1928-29 г. павялічваюцца на 138 проц. Ударнай задачай зьяўляецца падрыхтоўка новага калёнізацыйнага фонду ў 1000 гэкт.

Водаўг меркаваньняў Наркамзему, у 1928-29 г. па саюзнаму бюджэту на мэліярацыю ў БССР вызначаецца: 3.088 тысяч руб. безваротных асыгнаваньняў (што дае павялічэньне ў параўнаньні з асыгнаваньнямі на 1927-28 г. на 138 проц.) і 898.300 руб. зваротных сум (павялічэньне на 110 проц.).

Значная частка гэтых сродкаў прызначаецца на арганізацыю калёнізацыйных фондаў, бо без фарсіраваньня асушэньня беларускіх балот мы ня зможам хутка вырашыць крызіс аграрнага перанасяленьня. Па каштарысу намечана інтэнсыўна асушыць 3.450 гэкт. і распачаць засяленьне асушаных масываў.

Ударнай задачай таксама зьяўляецца падрыхтаўка калёнізацыйных фондаў: працяг работ на Мар'іне, новыя мельскае акругі), і Абруба-Чысьцікаму (Аршанскай акругі),—усяго 1000 гэкт. Апроч гэтага, будзе праводзіцца дасьледчая работа на 12 тысяч гэкт. балотных абшараў: па р. р. Прыпяці, Тальцы (Менскай акругі), Ляхавічы-Зімовічы (Мазырскай акругі).

У наступным годзе на Мар'інскім масыве мае быць ушчынута ў с.-г. карыстаньне новых 2450 гэкт. балотных абшараў.

Адначасна з гэтым будзе праводзіцца ўзмоцненая праца па мэліяраваньні найбольш каштоўных лясных абшараў. Дзеля гэтага мяркуецца пашырыць існуючую рэдкую асушыцельную сетку ў мэтах прыросту драўніны, а таксама палепшыць транспарт ня.

Дзеля таго, каб не ўтварыць разрыву паміж гідратэхнікай і культур-тэхнікай, пры Беларускай С.-Г. Акадэміі мае быць арганізавана катэдра па культур-тэхніцы, што дасьць магчымасьць ва ўмовах Беларусі падрыхтаваць патрэбныя кадры культур-тэхнікаў.

Ахова вёскі ад пажараў.

Пажарная інспэкцыя Народнага Камісарыяту Ўнутраных Спраў у пачатку вясны правяла значную працу па ўзмацненьні пажарнай аховы (асабліва ў вёсцы) у летні час. У чэрвені гэтага года была склікана ўмова з ВЗОК-ам (Масква) на атрыманьне 800 пажарных машын. З гэтай колькасьці ўжо атрымана 190 машын, якія ўжо даўно раскуплены сялянствам.

Дастаўка вёсцы пажарных машын дае магчымасьць паступова ўзмацняць супроцьпажарнае будаўніцтва на вёсцы. Але, на вялікі жаль, усіх пажарных машын Беларусь яшчэ не атрымала. Такія чынам, заключаная ўмова выканана толькі на 60—70 проц., і сялянства ў поўнай меры не задаволена пажарнымі машынамі.

Цікава адзначыць, што з боку сялянства назіраецца вялікі попыт на пажарныя машыны, а іх няма. Як відаць, вёска сама зацікаўлена ў супроцьпажарным будаўніцтве, і нашым мясцовым і цэнтральным органам гэту сялянскую ініцыятыву трэба цалкам і своячасова падтрымаць.

У гэтым напрамку ўжо робяцца некаторыя крокі. Па лініі ВСНГ вывучаецца пытаньне аб выпрацоўцы пажарных машын на нашых беларускіх заводах.

І вось, калі нашы беларускія заводы будуць выпрабаць гэтыя машыны, тады толькі мы вызвалімся ад залежнасьці ад замежнага рынку, сталага супроцьпажарнага будаўніцтва.

Акрамя ўсяго гэтага, нядаўна зроблены загады акруговым пажарным інспэктарам аб дасканалай праверцы пажарнай справы ў вёсцы; наколькі там правільна скарыстоўваюцца машыны, пажарны інвэнтар, а таксама, наколькі само насельніцтва прымае ўдзел у гэтай справе.

У пажарнай інспэкцыі НКУС няма ніякіх вестак аб тым, як скарыстоўваюцца сродкі ад самаабкладаньня на пажарную ахову. Гэта ня зусім добра.

Трэба стала нагляд, наколькі РВК і сельсаветы кіруюць гэтай справай, куды дзяюцца грошы, што будуецца і г. д.

Адным словам, трэба мець жывое кіраўніцтва і не чакаць, пакуль з акруг прышлюць сухія лічбы.

Пакуль ня позна, НКУС трэба зьвярнуць на гэта асаблівую ўвагу.

Што датычыцца гарымасьці, то водаўг вестак пажарнай інспэкцыі НКУС, гарымасьць у гэтым годзе значна паменшылася.

У Прэзыдыуме Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

28-га ліпеня г. г. пад старшынствам тав. А. І. Хацкевіча адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК БССР.

Разам з іншымі былі разгледжаны наступныя пытаньні:

АБ ДЗЕЙНАСЬЦІ ГАРАДЗКІХ І МЕСТАЧКОВЫХ КАМІТЭТАЎ УЗАЕМАДАПАМОГІ.

Заслухан даклад Народнага Камісарыяту Сацыяльнае Забясьпекі аб дзейнасьці гарадзкіх і местачковых камітэтаў узаемадапамогі.

Неабходнасьць адшуканьня сродкаў на аказаньне дапамогі асобам, якія ня маюць права на дзяржаўнае забясьпячэньне, выклікала арганізацыю гарадзкой узаемадапамогі. Усяго ў БССР мяецца 40 гарадзкіх і местачковых таварыстваў узаемадапамогі. Згодна маючыся ў Наркамсацабясьпекі зьвестак на 30 таварыствах, у апошніх налічваецца на 1-ІУ-28 г.—21.647 членаў, з якіх 4752 жанчыны.

Астача сродкаў па гэтых таварыствах складае 37444 р. Галоўнай прычынай камітэтаў узаемадапамогі зьяўляецца аказаньне ўсялякага роду дапамогі членам таварыстваў, шляхам: выдачы аднаразовых дапамог, уваротных сум, аказаньня мэдычнай дапамогі і інш. За час з кастрычніка 1926 г. па 1-ІУ-28 г. выдадзена розных дапамог беззваротна на 4420 р. і ўзваротна—36.296 р. Некаторыя таварыствы праводзілі таксама працу па арганізацыі працоўных арцеляй в сябраў таварыства; гэткіх арцеляй арганізавана—11.

Прэзыдыум ЦВК па дакладу пастанавіў арганізаваць камісію ў складзе т. т. Бэйліна (старшыня), Файнбурга (з заменай яго т. Лаўрыновічам), Калініна, Сімончыка, Пасынкоўскага, з удзелам прадстаўніка Наркамправы.

Камісіі даручана вывучыць пытаньне аб дзейнасьці гарадзкіх і местачковых камітэтаў узаемадапамогі, склясці праэкт адпаведнай пастановы і ўнесьці яго на зацьверджаньне Прэзыдыуму ЦВК у двохтыдняўы тэрмін.

АБ ПАДРЫХТОЎЧАЙ ПРАЦЫ ДА ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ.

Заслуханы даклад Цэнтральнай Выбарчай Камісіі аб падрыхтоўчай працы да перабыраў саветаў.

Прэзыдыум ЦВК прыняў да ведама праробленую ў гэтай галіне падрыхтоўчую работу і даручыў: Арганізацыйнаму Аддзелу распрацаваць праэкты пастаноў аб нормах выбараў дэпутатаў у гарадзкія саветы і аб узаемаадносінах паміж гарадзкімі выбарчымі камісіямі акруговых гарадоў і акруговымі выбарчымі камісіямі; Цэнтральнай Выбарчай Камісіі па атрыманьні з ЦВК Саюзу ССР прыблізных тэрмінаў перавыбараў саветаў, распрацаваць план правядзеньня кампаніі ў БССР.

АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ СЬВЯТКАВАНЬНЯ ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ АГАЛАШЭНЬНЯ БССР.

Згодна пастановы Прэзыдыуму ЦВК, арганізавана Камісія па падрыхтоўцы сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя агалашэньня БССР у складзе т. т. Хацкевіча (старшыня), Антанікоўскага, Агурскага, Галавача, Крэмер, Ісаева, Баліцкага, Цімашэнка і Яцкевіча.

Камісіі даручана распрацаваць план сьвяткаваньня і ўнесьці яго на разгляд Прэзыдыуму ЦВК, а таксама абгаварыць пытаньне аб прыстасаваньні да дзесяцігодзьдзя агалашэньня БССР пастаноўкі помніку У. І. Леніну ў гор. Менску.

АБ ПРАЦЫ ПРЫЁМНАЙ ЦВК.

У мэтах палепшаньня абслугоўваньня наведвальнікаў, якія зьвяртаюцца ў Прыёмную Прэзыдыуму ЦВК, наркаматы і іншыя цэнтральныя ўстановы, Прэзыдыум ЦВК пастанавіў: арганізаваць пры Прыёмнай ЦВК папярэдні разгляд заяў і просьб прыватных асоб з удзелам адказных прадстаўнікоў адпаведных Наркаматаў і цэнтральных устаноў пад старшынствам Загадчыка Прыёмнай ЦВК; абавязаць усе наркаматы і цэнтральныя ўстановы праводзіць рэгулярны прыём наведвальнікаў у сваіх установах, выдзяліўшы для гэтага, а таксама для сувязі з Прыёмнай ЦВК, адказных таварышоў (Намесьнікаў Наркомаў, членаў калегій, інспэктароў ці роўных ім асоб); прапанаваць усім акруговым і райённым выканаўчым камітэтам, гарадзкім, местачковым і сельскім саветам вызначыць у сябе час і сталы парадак прыёму наведвальнікаў членамі саветаў і выканаўчых камітэтаў; шчыльней зьвязаць працу Прыёмнай ЦВК з рэдакцыямі газэт для высьвятленьня працы Прыёмнай і паасобных фактаў бюракратызму і валакіты.

СЬЛЕДЗТВА ПА СПРАВЕ, ЯКОЕ БЫЛО ЎЗЬНЯТА КАНДЫДАТАМ Ў ЧЛЕНЫ ЦВК САЮЗУ ССР Т. ДУДЗІЧ АБ НЕПАРАДКАХ У МАЗЫРСКАЙ АКРУЗЕ.

Прэзыдыум ЦВК прыняў да ведама паведамленьне час. вык. аб. Наркам-юста і Пракурора Рэспублікі т. Рохмана аб тым, што сьледзтва для прыцягненьня да судовай адказнасьці ваватых па справе тав. Дудзіч—закончваецца. Прынята таксама да ведама паведамленьне Намесьніка Старшыні Мазырскага Акрвыканкому т. Цыганкова, што з боку Мазырскага АВК прынят шэраг мерапрыёмстваў да аздараўленьня станавішча працы ў двух райёнах—Тураўскім і Жыткаўскім, Мазырскае акругі, згодна пастановы Прэзыдыуму ЦВК ад 31-га мая 1928 г.

Прэзыдыум ЦВК канстатаваў, што частка з гэтых мерапрыёмстваў была прынята Мазырскім АВК у свой час пасьля паведамленьня з боку т. Дудзіч аб ненармальнасьцях і злачынствах.

ПРА КАСЫ ЎЗАЕМАДАПАМОГІ САМАТУЖНАПРАМЫСЛОВАЕ КААПЭРАЦЫІ.

Зьверджана пастанова ЦВК і СНК БССР пра касы узаемадапамогі саматужна-прамысловае каапэрацыі.

Згодна гэтай пастановы, члены прамысловых і працоўных арцеляй і прамыслова-крэдытных таварыстваў для ўсіх відаў матар'яльнае і культурнае узаемадапамогі могуць арганізоўваць касы узаемадапамогі з удзелам ня менш 50 членаў.

Статуты кас узаемадапамогі і іх саюзаў рэгіструюцца ў інспэкцыях мясцовае прамысловасьці акруговых выканаўчых камітэтаў, а калі дзейнасьць касы ці саюзу выходзіць за межы аднае акругі, то ў аддзеле мясцовае прамысловасьці Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР.

АБ ПАРАДКУ ДЫСЦЫПЛІНАРНАЙ АДКАЗНАСЬЦІ.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў палажэньне аб парадку дысцыплінарнай адказнасьці.

Згодна палажэньня, дысцыплінарныя пакараньні накладаюцца на ўсіх службовых асоб за ўчыненыя імі недагляды і правінпасьці, якія не прадугледжаны правіламі ўнутранага распарадку, у тых выпадках, калі на ступені важнасьці гэтых недагляду і правінпасьцяй асобы і органы, маючыя права накладаць дысцыплінарныя пакараньні, альбо судова-сьледчыя органы, пракурорскі надзор ці Рабоча-Сялянская Інспэкцыя—палічаць, што трэба караць ня ў судовым, а ў дысцыплінарным парадку.

Дысцыплінарныя пакараньні накладаюцца службовымі асобамі і органамі, якія назначаюць альбо выбіраюць на даную пасаду. Накладацца могуць наступныя дысцыплінарныя пакараньні: выгавар, выгавар з папярэджаньнем, перамяшчэньне на іншую пасаду, а таксама звальненьне з пасады па згодзе в РКК.

ГУЛЯНЬНЕ 20 ВЕСАК.

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

[illegible] ясная і ціхая заходняя сонца [illegible] ніводнай хмаркі. Свежы ветрык [illegible] расу страч, песьціць твары і радасна спатыкае грамаду.

Зраньня на залітай сонцам паляне пачынае выбірацца натоўпамі моладзь.

[illegible] далёка рэжуць гармошкі, а здрадніцкае рэха даносіць усё на паляну.

Афіцыйная частка павінна адбыцца роўна ў 11 гадзін. Да гэтага часу моладзь забаўляецца песьнямі, скокамі і музыкай.

Афіцыйная частка была маленькая. Усе выступаючыя таварышы апавядалі пра значэньне сёнешняга гуляньня, пра тое, якімі мерамі трэба адцягваць увагу моладзі ад хуліганства, п'янства і царквы. Ня толькі моладзь, але і старыя ўважліва слухалі афіцыйную частку: яны сёньня не пайшлі ў царкву, яны сёньня прышлі пагуляць з моладзьдзю, паглядзець новае культурнае жыцьцё.

Збоку каля лесу наладжан цір. Тут [illegible] і вялікія захопныя сярэдзіны.

— Куды цяліць?—пытаецца стары ў лапцях у камсамольца.

— У яблычка, у гэную цёмную плямку,—паказвае судзьдзя ціру, скоячы каля цэлі.

— А трэба папасьці?—жартліва пытаецца стары.

— Вядома, пастарайцеся, дзядзька,—падтрымліваюць суседзі.

— А за гэта?

— Тры пачкі папярос, мыла і рушнік.

Ахвотна цэліцца дзядзька. Папяросы, мыла і рушнік вабяць яго, і ён, уважліва, углядаючыся ў яблычка, зноў цэліцца.

Стрэл. Стары застаецца ў той-жа позе, у якой быў. Натоўп кінуўся да цэлі. Дружны таварыскі сьмех абудзіў цішыню лесу.

— Прамахнуўся дзядзька!— крыкнуў уголас натоўп.

— Гэй, ня ўмееш страляць!—съмяецца адзін хлапец.

— А ты лепш страляеш?—агрызнуўся стары, перадаючы вінтоўку.

— Вядома, лепей! Я хоць ня ў цэнтр яблычка трапіў, але ўсё-ж каля яго

— Нічога, дзядзька, не абражайся,—кажа далей хлапец.—Я ўсю зіму ў гуртку вучыўся страляць і то цяпер у яблычка не папаў.

— А ну цябе!—адмахнуўся ад яго стары і, засмучоны няўдачай, адышоў у бок.

Судзьдзя назваў новае прозьвішча. Падышоўшы стары, узяў стрэльбу і пачаў цэліцца.

— Вучыся, дзядзька, страляць. Хваля съмеху падтрымлівае словы чырвонаармейца, шэфа вёскі, прышоўшага на гуляньне.

— Страляю, страляю, ды ніяк вось гэта ня выстраляю,—адказаў стары, паказваючы рукой на рочы, што ляжалі на століку.

Яшчэ весялей праходзіць лётарэя арганізаваная Сельвыканкомам. Тут народу шмат. Дый папяросы, шроты, пячэньне, мыла, цукеркі—вабяць да сябе гуляючых.

— Дайце мне дастуліцца, я хачу выйграць,—пачуўся ззаду дзіцячы галасок.

— Выйграваў, выйграваў,—адказаў натоўп, прапушчаючы наперад хлапчука.

— Вось вазьмі грошы, дай пацягнуць,—кажа пінэр гадкоў 8, трымаючы ў руцэ грыўню.

Хлапец нерашуча запусьціў руку ў вурну і выцягнуў адтуль скручаную і перавязаную ніткаю паперку.

— Ёсьць, ёсьць!—пішчыць ён радасна.—На пусты, напісана,—кажа ён перадаючы паперку. Маленькі тварык шырока ўсьміхаецца, а вочкі прагна глядзяць на столік. Сэкунды для яго цягнуліся, як вечнасьць, пакуль лётарэйшчык правяраў у кніжцы нумар білету.

Ён выйграў дзьве пачкі «Пушкі».

— І я пацягну,—сказала немалодая вясковая кабета, разьвязваючы рог хусткі і выцягваючы адтуль грыўню.

— Ты добра пакапайся ў скрыні і выйграеш—парадзіў ёй ужо вопытны шчасьлівец-піянэр.

Старая таксама выйграла. Яна атрымала цукеркі.

— Ага, што я казаў?—зноў зьвяртаецца да яе шчасьлівец. Я казаў што выйграеш.

— Вам-бы. шчасьлівцы, памяняцца, съмяецца нехта з натоўпу.

— Ты-ж цукеркаў ня можаш есьці у цябе зубоў няма, а папяросы твой стары выпаліў-бы,—зноў жартуе з яе нехта.

— Зараз будзе конкурс гарманістаў —абвяшчае адзін таварыш са сцэны, пабудаванай на паляне.

Гарманісты, якія запісаліся для ўдзелу, ужо сабраліся. Іх было шмат. Ад кожнай вёскі выступала па некалькі чалавек. Публіка разселася каля сцэны на мураўцы і слухала народныя беларускія песьні.

Дружна была спаткана дзяўчына-гарманісткa з вёскі Німаніцы: яе асабліва ўважліва слухалі прысутныя, бо яна—адзіная кабета сярод выступаючых на гуляньні.

Зачырванеўшыся, яна сыйшла са сцэны.

— Дрэнна я грала,—зьвярнулася яна да сваіх, німаніцкіх.

— Тут столькі вачэй глядзіць, што неяк пальцы дрыжаць і пры гэтым гармошка не свая.

— Нічога,—падтрымліваюць яе свае Усё-ж такі прыз атрымала.

Воддаль расьцягнуўся харавод. Тут была толькі моладзь.

Прыемна гучыць народная беларуская песьня. Мімаволі заслухаешся і ня можаш адарвацца. А песьня пра Беларусь, пра яе прыроду і харастно, пра жыцьцё беларусоў. Усё роднае...

Аркестр заглушае харавод. Арганізаваліся скокі проста на дварэ. Тут старыя і моладзь, босыя і абутыя. Усе скачуць.

— Хадзем, цётка, скакаць!—запрашае чырвонаармеец старую.

Радасна яна скінула са сьпіны клумак і закружылася...

І яна сёньня не пайшла ў царкву.

Застаецца вітаць першыя вопыты адцягваньня ўвагі насяленьня ад хуліганства, п'янства і царквы.

Пажадаем, каб гэткія вопыты шырока і часта праводзіліся на нашай Беларусі.

Рыгор Ге.

В. Німаніца, Менск. акр., Бабр. райёну.

„КАПШАЯМ—АЛОХ".

Мэліярацыя ці зьдзек?

Нічога так адразу ня кідаецца ў вочы першаму і сьвежаму чалавеку, які ўвойдзе ў Смалявіцкі РВК,—як прыём адказнымі працаўнікамі сялян.

У гэтую галіну бюракратызму, паколькі яна яшчэ слабая ў сваім першапачатковым разьвіцьці—Смалявіцкі РВК з усіх сіл і надтрымоўвае. Іначай-жа і нельга, бо хто-ж у Смалявічах і будзе больш начальнік за старшыню РВК Жука і сэкратара Хадыку?!. Мялюзга ўсе!..

Дзіўна было чуць, калі сэкратар РВК, праглядаючы справы Кляніцкага с.-с., глянуў скоса на сэкратара с.-с. т. Першая і злосна крыкнуў:

— Гэта ў мяне не чалавек, калі перада мною не калоціцца!.. Вот я, напрыклад, прыеду ў Жодзінскі с.-с.—дык там так калоціцца перада мною сэкратар, што аж стол ходарам ходзіць!..Во, гэта дык сэкратар!..

І калі гэта было заўважана на сходзе сялян у той-жа вёсцы, перад тварам сэкратара Смалявіцкага райкому т. Нерадава—дык уявеце, якое было ўсіх сялян зьдзіўленьне, калі той-жа Нерадаў выступіў в такой абаронай:

— А што-ж вы думаеце?!. Калі ня будуць перад адміністрацыйным ліцом калаціцца—дык нічога і ня будзе!..

І наогул пачаў разводзіць аб карысьці дрыжэньня паджылкаў.

А калі ўзяць, к прыкладу,—адносіны «вышэйшага начальства» да свайго ніжэйшага. За адну толькі нязначную спрэчку б: завхоза, (ён-жа і старшыня мясцкому) Смалявіцкай больніцы т. Кашаля Тодара з старшынёй РВК Жукам—Кашэль так ёмка выляцеў з сваей пасады, што і цяпер ходзіць [illegible] хлеба.

Мо' вы падумаеце, што скарацілі нагоган пасаду завхоза больніцы?.. Дзе там!.. Пасада асталася, але для «упрощения работ и средств» гэту пасаду абслугоўваюць на чарзе фэльчары.

Канешне ня бывае і бяз кур'ёзаў. Так, напрыклад, адзін стары фэльчар, каб не абмыліцца ў паперах (які-ж ён спэц) узяў яшчэ к сабе ў дапамогу сваю нявестку. Вот і „упрощение"—дзе быў адзін—цяпер працуюць двое...

Аднак гэта нішто ў параўнаньні з тымі падзеямі, якія толькі надаўна адбыліся. Для гэтага я павінен астанавіцца і перадаць увесь малюнак па парадку:

Каля шляху, на ўзгорку ляжыць вёска Заказінец, Варатоўскага с.-с., дзе жывуць спрадведныя гаспадары яе—Капшаі. Гэтыя восем гаспадарак маюць у сярэднім на 11—7 душ сям'і па 6-5 дзесяцін зямлі і наогул у сярэдніх плошчадзь 9—12 рублёў падатку. Жывуць на бедна-пясчанай глебе. І адзіным падспор'ем для іх—каровы, якіх трымаюць усёж-такі па адной, дзьве, і толькі ў аднаго гаспадара—тры штукі.

Для пашы яны маюць спрадвечны, за шматма іх гумён, выган у дзесяцін 12. Гадоў 20—25 таму назад, гэтыя Капшаі свой забалочаны, абросшы кустарнікам выган расьцерабілі і самі пракапалі на ім 3 канавы даўжынёй усе, прыблізна, 220 сажняў, на гэтым расьцяробе і пасьвіла вёска сваіх кароў, бо без яго—бяры карову на вяроўку і вядзі па межах.

У 1926 годзе праходзіла земляўпарадкаваньне і чамусь-ці гэты выган адыйшоў ад сяльчан у запасфонд (хутчэй усяго як агульная паша) і райёная сялянь. земельн. камісія прадстаўляе гэты сухі выган сялянам з другога хутару, дзе... мэліярацыі!

Менская АЗК аставіла выган за Капшаямі.

Прадстаўнік вясковага мэліярацыйнага т-ва М. Пятроўскі, з дазволу РВК, закладае на сухім вучастку Капшаёвага выгану—паказальны вучастак памерам у 0,25 дзесяціны.

Што-ж гэта за таварыства?.. Гэта сяльчане вёскі Заказінец, якія жывуць у адлеглясьці Капшаёў у 1,5 вярсты. Заможнікі, нават, кулакі. Так, напр. М. Пятроўскі мае ў сваім карыстаньні 20 дзесяцін пахаты, 5 дзесяцін сенажаці, кавалак уласнага лесу на 3-4 душы.

Сам-жа ён старшыня с.-с. і старшыня мэліярацыйнага т-ва, камсамолец!.. Іншыя, як гр. Салодкіх, Пратасэвічаў, Сарокаў і Концей маюць па 14 дзесяцін на гаспадарку (Салодкія і Сарокі) па 9 дз., (Пратасевічы) у 3-х гаспадарою па 15 дз. і ў аднаго—18 дзесяцін на гаспадарку (гр. Концеі).

Дзеля таго, каб ніхто ня мог парушыць іх спакою, ды каб убіцца ў давер'е ўлады—яны ўсякімі хітрыкамі падлезьлі пад РВК, пад крылышкам Жука і загад. земаддзелам Вашкевіча з'арганізавалі мэліярацыйнае т-ва і пачалі сваю работу, не на балоце, якое ёсьць і якое трэба асушыць, а на сухім выгане Капшаёў!..

І вось калі Менскае АЗК устанавіла права на карыстаньне Капшаям,—Пятроўскі падае заяву ў Смалявіцкую РЗК, каб адняць ад Капшаёў выган, дзе гэта справа за № 50 і разглядалася ад 22-ХІ—27 г., і Пятроўскаму адмоўлена.

І дзіўна!.. Капшаі маюць на руках пастанову Смалявіцкай РЗК, што Пятроўскаму (мэліярацыйнаму т-ву) адмоўлена захапіць выган Капшаёў—аднак, на распараджэньню таго-ж РВК,—Пятроўскі, Салодкія, Концеі і Інш. прыходзяць араць гэты выган. Перш на месца прыяжджаў загадчык РЗК Вашкевіч і заверыў, што Пятроўскі ня мае права карыстацца, а потым, на трэці дзень, прыехаў і «начальственна» рыкнуў:

— Арыштаваны вы ўсе будзеце, калі што якое... калі будзеце Пятроўскаму супярэчыць!..

Маючы на руках такі важкі дакумант, як пастанова Смаляв. РЗК, Капшаі Пятроўскага з К° ня пусьцілі на выган. І «т-ва» падалі ў міліцыю заявы, што Капшаі іх на балоце пабілі... А там з боку Капшаёў былі толькі бабы, тады як на работу з боку «т-ва» прышлі мужчыны, і бойкі ніякай ня было. Цяпер Капшаёў цягнуць у суд за няма ведама што!?.

Была аб гэтым падана ў Менскую АЗК падрабязная заява, з просьбай прыняць якія-небудзь „меры"—і заява прышла ў РЗК (на каго і скардзіліся!) назад з дзіўнай разалюцыяй:

«Растлумачыць гр. Капшаям надрабязна, бо яны не зразумелі...».

А што не зразумелі: ці то, што Капшаі падавалі, бо ня трэба было на добры лад і ўсім падаваць заявы, справа ясная за кім выган, ці мо сама Менская АЗК нічога не зразумела, а калі і зразумела, дык баялася ўгняьіць Смалявіцкую РЗК?!. Тут, дык, праўда, незразумела!.. Хто-ж растлумачыць Капшаём?.. Ды ніхто! РВК цяпер сядзіт на іх, што яны скарджацца на РВК і лазяць усюды па ўстановах, а свой с-савет і падаўна, бо там старшыня—Пятроўскі.

На выган цяпер Капшаёў ня пускаюць ні нагой, нават зьдзекуюцца над імі. На дзёрне, пасьля сваей працы, аставілі такія словы:

Капшаям алох!

Прыходзяць вечарамі Капша

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

па дакладу Ушацкага райённага выканаўчага камітэту Полацкае акругі аб стане райбну і аб сваёй дзейнасьці.

Выслухаўшы дакляд Ушацкага райённага выканаўчага камітэту Полацкае акругі, Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што за справаздачны перыяд у працы райённага выканаўчага камітэту ёсьць наступныя дасягненьні:

1. Сельскія саветы, як і райённы выканаўчы камітэт, у большасьці працуюць паводле плянаў, якімі прадугледжана паступовае большае ажыўленьне ўсяго савецкага апарату да насельніцтва праз яго спрашчэньне, рацыяналізацыю і праз рашучую барацьбу з бюракратызмам і валакітай і, захоўваючы савецкую дэмакратыю, широка разгарнуць крытыку і самакрытыку.

2. Зьвярнуць больш увагі ўзмацненьню працы сельскіх саветаў, ажыўленьню існуючых камісій і большаму прыцягненьню да працы саветаў выскоага актыву, інтэлігенцыі, наладзіўшы ў самы бліжэйшы тэрмін сталы падлік. Інструктаванье і агляд працы сельскіх саветаў праводзіць у плянавым парадку і праз больш сталых адказных працаўнікоў райбнаў. Разам з гэтым зьвярнуць асаблівую ўвагу на выхаванье і скарыстанье мясцовага актыву і на большае прыцягненьне жанчын да практычнае савецкае, каапэрацыйнае і грамадзкае працы.

3. Замацаваньне шматпольля, больш шырокі перавод плошчы на шматпольныя севазваротры, пашырэньне плошчы тэхнічных, трудаёмкіх і травяных культур, вырашчыванье на месцы гатунковага насеньня, лепшая апрацоўка глебы праз ужыванье больш складаных сельска-гаспадарчых машын і ўжыванье штучнага угнаеньня павінна зьяўляцца адной з галоўных задач у працы райённага выканаўчага камітэту і сельскіх саветаў.

4. Рабіць крокі да хутчэйшага ўмацненьня калектыўных гаспадарак праз рацыянальную пастаноўку іх працы, праз належную дапамогу ім, у выпадку аграномічную з боку райённых аграномаў, з мэтаю падвысіць калектыўныя гаспадаркі да ўзроўню прыкладу для акольнага насельніцтва. Разам з умацненьнем становішча існуючых калектыўных гаспадарак рабіць захады да ўтварэньня новых, асабліва з насельніцтва польскай, латыскай і яўрэйскай нацыянальнасьцяў.

5. Райённаму выканаўчаму камітэту і сельскім саветам зьвярнуць больш увагі на пашыраньне сеткі спэцыяльных відаў сельска-гаспадарчае каапэрацыі, галоўным чынам, за лік бядняцкае часткі вёскі, і на разгортваньне працы існуючых праз лепшае арганізацыйна-тэхнічнае абслугоўваньне і стварэньне ўмоў, спрыяючых пашырэнню працы. Асаблівую ўвагу належыць зьвярнуць на працу сельска-гаспадарчае крэдытнае каапэрацыі, на павялічэньне каапэраваньня гэтай сыстэмай каапэрацыі, на больш правільнае разьмеркаваньне пазык, зьнікненьне пратэрмінаваньняў на пазыках, зьнішчэньне дэфіцытнасьці ў далейшай працы і павялічэньне як уласных паявых, так і ўкладных сродкаў, акруговаму выканаўчаму камітэту і Белсельбанку даручаецца зрабіць захады да пакрыцьця маючайся дэфіцытнасьці.

6. Падлічваючы прымежнасьць Полацкае акругі са значным лікам райённаў ільнаводчаскіх і нязначнасьць земляўпарадкаванае плошчы (каля 25 проц. разам з дарэвалюцыйным земляўпарадкаваньем), прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства зрабіць захады, каб земляўпарадкаваньне ільнаводчаскіх і прымежных райённаў было абавязкова скончана не пазьней як устаноўлены тэрмін. Пры правядзеньні земляўпарадкаваньня ўлічваць патрэбу выканаўчу камітэту пашырыць растлумачальную працу на выбары такіх форм землякарыстаньня, якія-б спрыялі хутчэйшаму ўмацненьню аграмадзканага сэктару ў вытворчасьці сельскае гаспадаркі.

7. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Полацкаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту прасачыць за тым, каб не пазьней 1 кастрычніка бягучага году былі перагледжаны дагаворы на карыстаньне лясамі мясцовага значэньня і скасаваны тыя ў іх, па якіх лясы замацаваны неправідлова, а разам з гэтым прынаць захады каб ва ўстаноўленыя планам тэрміны ўсе лясы дзяржаўнага значэньня былі лесаўпарадкаваны.

8. Падлічваючы практыку правядзеньня мінулых гаспадарчых кампаній, райённы выканаўчы камітэт павінен зрабіць усе захады да своечасовага і поўнага выкананьня плянаў загатовак, у выпадку на экспартнай сыравіне, да 100 проц. спагнаньня сродкаў па самаабкладаньні і зараз-жа распачаць працу па падрыхтоўцы да правядзеньня асенньняй пасеўнай кампаніі.

9. Баручы пад увагу адсутнасьць у райённым цэнтры больш-менш здавальняючага памяшканьня для правядзеньня культурна-асьветнае працы, заапрацаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў выдаць райённаму выканаўчаму камітэту за кошт рэзэрвнага фонду Савету Народных Камісараў 3.000 руб. на рамонт і абсталяваньне маючагася будынку.

10. Адлегласьць сельскіх саветаў ад райённага цэнтру, адсутнасьць добрых шляхоў, прымежнасьць райёну выклікаюць крайнюю неабходнасьць наладзіць тэлефонную сувязь райённага выканаўчага камітэту з сельскімі саветамі, у зьвязку з тым Савет Народных Камісараў прапануе Улаўнаважанаму Народнага Камісарыяту Пошт і Тэлеграфаў і Полацкаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту высьветліць магчымасьць у бліжэйшы час наладзіць тэлефонную сувязь хаця-б з больш адлеглымі сельскімі саветамі.

11. Райённы выканаўчы камітэт і сельскія саветы павінны і далей праводзіць працу на паглыбленьні нацыянальнае палітыкі, у прыватнасьці беларусізацыі, і на палепшаньні эканамічнага становішча яўрэйскага мястачковаго насельніцтва, усебакова высьвятляючы насельніцтву сутнасьць нацыянальнае палітыкі і цалкам абслугоўваючы нацыянальныя меншасьці ў райёне.

13. Усёй сыстэмай далейшай працы імкнуцца да яшчэ большага гаспадарчага і арганізацыйна-палітычнага абслугоўваньня беднаты, падвышаючы яе самадзейнасьць і агульную ўвагу ва ўсім жыцьці райёну.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР М. Мароз.

21 ліпеня, 1928 г.
г. Менск.

ХРОНІКА.

УДЗЕЛ БЕЛАРУСКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ У НІЖАГАРОДЗКІМ КІРМАШЫ.

Старшыня Белпайгандлю тав. Луцкевіч у гутарцы з нашым супрацоўнікам паведаміў наступнае аб удзеле беларускай прамысловасьці ў ніжагародзкім кірмашы, які адчыняецца і жніўня.

— Сёлета Белпайгандаль упершыню выступае адзіным прадстаўніком ад усёй беларускай прамысловасьці — дзяржаўнай, мясцовай, саматужніцкай і працаколектываў.

Усяго Белпайгандаль мяркуе рэалізаваць тавараў на 1000000 р. З гэтай колькасьці па дзяржаўнай прамысловасьці мае быць рэалізавана: шпалераў—на 200000 р., паперы—на 25000 р., шкляной прадукцыі—на 80000 р., прадукцыі Лесбелу—на 20000 руб., Белскуртрэсту—на 50000 р., махорачных вырабаў—на 20000 р. і прадукцыі Меншэвіі—на 100000 р.

Па мясцовай прамысловасьці мяркуецца рэалізаваць: абутку—на 200000 р., гатаванага адзеньня—на 200000 р. і інш. тавараў—на 100000 р.

Белпайгандаль мяркуе закупіць на ніжагародзкім кірмашы інструманты, тэхнічную і імпартную прадукцыю, сыравіну і інш. тавараў, прыблізна на 100000 р.

Трэба адзначыць, што па некаторых відах тавараў, Белпайгандаль сёлета выступіць на кірмашы ўпершыню (галантарэя, прадукцыя Меншэвіі і інш.

Наогул кажучы, сёлета [беларуская прамысловасьць выступае на ніжагародзкім кірмашы больш арганізавана.

Экспэдыцыя па Усходняй Беларусі.

Выправілася ў Менск экспэдыцыя навуковых працаўнікоў і студэнтаў, якая наведала Ленінград, дзе адведала ўсе музэі, у якіх ёсьць беларускія калекцыі, і прайшла па Усходняй Беларусі пехатой. З Гомелю экскурсанты прыехалі поездам у Меншчыну, дзе па Самахвалавіцкім і Сьмілавіцкім райёнах зноў прайшлі пехатой. Экскурсіяй выяўлена шмат помнікаў старасьветчыны, запісана жаночая адзежа, запісана шмат цікавых народных слоў і інш. Цяперака матар'ялы навукова апрацоўваюцца.

Дапамога кітайскім рэвалюцыянэрам.

Скарбоначныя зборы на дапамогу кітайскім рэвалюцыянэрам, якія праводзіліся па Менску 28 і 29 ліпеня, далі 766 руб. Масавае гуляньне, наладжанае ячэйкай Мопр'у ДПУ—звыш 400 руб. Усе гэтыя сродкі пойдуць у карысьць [2-хтыднёвіка дапамогі кітайскім рэвалюцыянэрам.

Падрыхтоўка да ўсесаюзнай нарады рабселькораў.

У Менскім акругоме КП(б)Б распачалася падрыхтоўчая кампанія да Усесаюзнай нарады рабселькораў.

Ужо адбылася нарада па гэтым пытаньні. Нарада пастанавіла отварыць пры акругоме адзіны камітэт па падрыхтоўцы да Усесаюзнай нарады рабселькораў.

Такама пастаноўлена ў пачатку жніўня склікаць агульна-гарадзкі сход рэдактароў насьценных газэт, дзе будзе пастаўлен дакляд на тэму—„Усесаюзная нарада рабселькораў і нашы задачы".

У канцы жніўня па Менску пачнецца агляд насьценных газэт і рабкораўскіх гуртковў на прадпрыёмствах.

Прамірваныя газэты і гурткі атрымаюць месцы на Ўсесаюзнай нарадзе рабселькораў.

Фонд абароны.

У Менскі акрсавет ТДА-Авіяхіму штодзённа паступаюць сродкі ад ячэек у фонд абароны краіны, ад ячэек ТДА-Авіяхіму.

Ячэйка станцыі «Фаніполь» МБВ чыгункі ўнесла 33 р. 61 кап., ячэйка Мінаўрфа —26 р. 76 к. і ячэйка акрміліцыі—50 р. 42 кап.

2500 руб. на арганізацыю майстэрні для бяспрытульных.

Менская акруговая камісія дапамогі дзецям вядзе падрыхтоўчую працу да адчыненьня з 1 верасьня павецкай майстэрні на 40 падлеткаў бяспрытульных. На абсталяваньне і рамонт памяшканьня майстэрні адпушчана 2.500 руб.

Дапамога маткам-адзіночкам.

Менскі Помдзет штомесяц выдае грашовую дапамогу ў ... Усяго дапамога штомесяц выдаецца на 250 дзяцей. Сёньня пачынаецца выдача дапамогі за жнівень месяц.

Ясельная кампанія.

Ясельная кампанія на Меншчыне ... поўным разгары. Усімі ясьлямі ахоп... 1300 дзяцей сялянскай беднаты і ... савгасаў. У жніўні і верасьні акруговая інспэкцыя аховы маці і дзіцяці атрымала ад Помдзету 4000 руб. У рахунак гэтай сумы ўжо выдадзена 400 руб. і 2000 руб. будзе выдадзена гэтымі днямі.

Месячнік дапамогі дзецям.

Сёньня на пашыраным пасяджэньні менскага акрпамзету сумесна з прадстаўнікамі вапікаўленых устаноў будзе зацьверджаны плян правядзеньня месячніка дапамогі бяспрытульным дзецям. Месячнік распачнецца 15 жніўня. Мяркуецца правесьці шырокую тлумачальную кампанію на прадпрыёмствах, установах і жактах. У час месячніка будзе праведзена шырокае абсьледаваньне дзіцячых устаноў.

Склад прыймовых камісій БДУ.

Праўленьне БДУ на сваім апошнім пасяджэньні зацьвердзіла склад прыймовых камісій па факультэтах для прыёму студэнтаў на 1928-29 акадэмічны год.

У склад прыймовай камісіі медфаку ўваходзяць: ад БДУ дэкан праф. Кроль, нам. дэкана асыстэнт т. Пракопчук і прадстаўнік ад студэнцтва тав. Ахрамовіч.

У склад прыймовай камісіі педфаку вызначаны наступныя: дэкан праф. М. Піотуховіч, нам. дэкана т. Усьпенскі, дацэнты т. т. Панкевіч і Вейнгер і прадстаўнік ад студэнтаў тав. Крупяніў.

У прыймовай камісіі прагасу прызначаны: дэкан праф. Вольфсон, нам. дэкана асыстэнт т. Канапліп і прадстаўнік ад студэнтаў тав. Кубан.

Старшынямі прыймовых камісій зьяўляюцца дэканы.

Адначасова праўленьне БДУ пастанавіла прасіць Нар. Кам. Асьветы далегаваць у прыймовыя камісіі прадстаўнікоў ад інспэктуры Нар. Кам. Асьветы і ад адпаведных арганізацый.

Курсы прапагандыстаў.

Учора, 31-га ліпеня, скончылі сваю працу месячныя курсы прапагандыстаў—рабочых ад станка.

Усяго на курсах займалася 60 чал. Скончыўшыя курсы будуць выкарыстаны па лініі партасьветы.

Гэткія-ж курсы на 40 чал. адчыніліся ў гор. Барысаве.

Палепшылася абслугоўваньне насельніцтва поштай.

Па даным Менскай паштова-тэлеграфнай канторы, за першае паўгоддзе бягучага гаспадарчага году палепшылася абслугоўваньне поштай насельніцтва Менскай акругі.

Калі на 1-га студзеня г. г. пошта абслугоўвала насельніцтва на 80 проц., дык на 1-га ліпеня ёю абслугоўваецца 82 проц.

На менскім хлебазаводзе.

Увесь штат хлебнага заводу ў сучасны момант складаецца з 162 чалавек.

Рабочыя заводу ня ўсе кваліфікаваныя. Але яны ўсе за час працы прайшлі вялікую практыку, і гэты вопыт даў значны штуршок у прадукцыі заводу.

Сярэдні заработак рабочага—67 р. у месяц (ня лічачы выпадкаў асабівай сьпешкі, звыштэрміновых).

Нармальная праца на заводзе пачалася ў канцы мая. У маі выпечана хлеба розных гатункаў 34791 пуд.; у чэрвені—60396 пуд.—павялічэньне на 38 процантаў.

Калі перавесьці гэту прадукцыю на грошы, то ў маі выпечана на 108423 руб., а ў чэрвені—на 139874 руб.

Першы час працавалі ў адну зьмену, а ў канцы мая пачалі працаваць у тры зьмены.

Значная ўвага аддаецца заводам пытаньню аб сыстэматычным зьніжэньні цэн. Гэта ўдарная задача, якая ня сходзіць з парадку дню.

Некаторыя вынікі эканоміі ўжо маюцца. Церайшлі на апал вугалем. Пакуль што вынікі невялікія--мала кваліфікаваных качагараў. У далейшым пераход на апал вугалем дасьць эканомію тысячу рублёў у месяц.

Зараз выпечка дасягае 2200 пудоў штодня. З часам будзе павялічэньне да 2400-2500 пуд. у дзень.

Згодна пяцігадовага пляну можна спадзявацца пашырэньня працы заводу на 50 процантаў. Зразумела, гэта будзе мець уплыў на патаньненьне прадукцыі.

З.

Менскі дзень.

10000 руб. сёлета адпусьціў Наркамздраў БССР на рамонт цэнтральнай рабочай і адзэй райённай амбулёторыі ў Менску.

На 1,5 мільёнаў рублёў мяркуе ў наступным годзе экспартаваць розныя скрэвіны спажывецкая каапэрацыя БССР.

4-хтыднёвыя курсы для перападрыхтоўкі працаўнікоў с.-г. крэдытнай каапэрацыі будуць праведзены ў жніўні.

Наркамаасьветы даў дырэктывы рэарганізаваць па адной высокай сямёхгодцы ў школу сялянскай моладзі (у кожнай акрузе).

Калёнію для псыхічна-хворых у Новінках мяркуе адчыніць у наступным годзе Наркамздраў.

Падрыхтоўка зубных дактароў для вёскі.

З мэтай падрыхтоўкі зубных дактароў для працы на вёсцы, у якіх у сучасны момант распублёка мае вялікую патрэбу, пры Адантолёгічным Інстытуце Нар. Кам. Аховы Здароўя і пры Клініцы Пастаматалёгіі БДУ ўстанаўліваецца стажыраваньне дзеля перападрыхтоўкі зубных дактароў.

Прадмет стажыраваньня—6 месяцаў.

Усе жадаючыя дзеля стажыраваньня зубрачы павінны даць падпіску аб абавязковай службе за стаж на БССР ня менш адпаго году.

Гатае мерапрыёмства дасьць магчымасьць падрыхтаваць зубных дактароў для працы на вёсцы.

Гастролі цырку.

8 сёмага жніўня ў Менску пачнуцца гастролі цырку Кіесо, які выступіць з досыць багатай праграмай, у якой, памім іншым, будуць выступаць 16 дрэсіраваных коняй.

У канцы сезону мяркуецца наладзіць французкую барацьбу з удзелам вядомага барца Паддубнага.

Арганізацыя групавых садоў.

Нар. Кам. Земляробства вызначыў адпусьціць насельніцтву на восень 250.000 пладовых сажанцаў-яблык і груш.

З гэтай колькасьці 207.000 пладовых сажанцаў будзе адпушчана выключна для арганізаваці групавых садоў, для якіх намечана выдзяліць плошчу ў 1006 гэктараў зямлі.

Телефонная сувязь у Менскай акэруе палепшылася.

З вывадаў абсьледаваньня выявілася, што тэлеграфна-тэлефонная сувязь, як па Менску, гэтак і па акрузе ў параўнаньні з мінулымі гадамі значна палепшылася і знаходзіцца ў здавальняючым становішчы, а па некаторых адцальных відах маюцца нават дасягненьні.

Так, пабудован механічны канвэер на абору тэлеграм, пабудован бяшумны тэлефон для перадачы тэлеграм па тэлефоне.

Асабліва маюцца значныя дасягненьні ў справе росту абанэнтаў.

Так, пачынаючы з кастрычніка 1927 г. па чэрвень месяц 1928 г.; сетка абанэнтаў выраслa на 40 проц.

Яўрэі на зямлі.

25-га ліпеня г. г. мінула 4 гады ад дня выданьня ўрадам БССР дэкрэту аб заснаваньні беларускага „Камзэту" (камісіі па ўпарадкаваньні працоўных яўрэяў на «Камзэце» паставіў сабе галоўнай мэтай: дапамагчы савецкаму ўраду ў перабудове эканомікі яўрэйскіх мас.

Царскі ўрад не даваў магчымасьці працаваць яўрэйскім масам на зямлі і большая частка гэтае масы займалася толькі гандлем і пасрэдніцтвам (маклярствам). Трэба было перайсьці на новыя экаламічныя рэйкі, а ўласна: даць яўрэям зямлю для апрацоўкі, зрабіць іх земляробамі.

За 4 гады свайго існаваньня „Камзетам" было пераведзена на зямлю 2800 новых яўрэйскіх сем'яў, а звыш 1600 сем'яў пераселілася на зямлю ў Крым і Біра-Біджан.

У канцы 1924 г. у Менску адбыўся І-шы сьезд яўрэйскіх сялян у Беларусі, які ў іх да таго часу быў невялікі. Зьезд выклікаў вялікі энтузіязм сярод яўрэйскіх працоўных мас, як гістарычная падзея.

Ад таго часу мінула ўсяго 3 гады і колькасьць земляробаў за гэты час павялічылася амаль у два разы. Выраслa 200 моцных яўрэйскіх калектыўных гаспадарак. Такім чынам—зьяўленча вясковая легэнда, што яўрэі ня здольны да земляробства.

Другі зьезд яўрэйскіх сялян, які адбыўся ў Менску ўзімку гэтага году, ужо меў магчымасьць сьвердзіць, што дырэктывы партыі і мерапрыёмствы Савецкае ўлады стварыць яўрэйскае сялянства далі станоўчыя вынікі.

У сваіх прамовах дэлегаты—яўрэі зьвязу пацьвярджалі, што адносіны да іх з боку сялян беларусоў, таксама з боку сялян іншых нацыянальнасьцяў, вельмі добрыя.

С. З.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

(НА 1-УІІІ 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—64, куп. 4—62.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—16,5 куп. 5—14,5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—02,5, куп. 5—00,5.

Абл. 10 пр. паз. 27 году —прад. 25,98, куп. 25—88.

Абл. дзярж. паз. 26 г. — прад. 122, куп. 120.

Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 102—75, куп. 102—00.

Абл. 6 проц. паз. індустр. прад. 25—20 куп. 25—10.

Вынікі 6-цітыднёвых курсаў у Менску.

19 ліпеня скончыліся шасьцітыднёвыя курсы ў гор. Менску па перападрыхтоўцы настаўніцтва Менскай акругі. На ліпню будзе падвесьці вынікі праслуханых лекцый.

Зьяўляецца мімавольнае імкненьне к параўнаньню настроіў, з якімі настаўніцтва рыхтавалася да гэтай паездкі у сталіцу нашай Беларусі, з настроем яго значнай часткі ў сучасны момант.

Колькі надзей, колькі зацікаўленасьці, чаканьняў было сярод настаўніцтва. Здаецца, ня было на сьвеце абставін, якія-б затрымалі гэта імкненьне к папаўненьню ведаў пасьля шматгадовага гатаваньня ва ўласным саку. Не затрымлівала на месцох матар'яльна цяжкае становішча тых, хто ехаў на свой кошт, нават кепскія сямейныя ўмовы. У гэтым напрамку цікава адзначыць чатыры выпадкі,—калі настаўніца-маці зьяўлялася на курсы з дзіцём на руках, якое заставалася пры ёй на працягу шасьцітыднёвага тэрміну. А колькі настаўніц пакідала сваіх дзяцей часам на чужыя рукі.

Адчыніліся заняткі. Захопленасьць адчувалася на кожным кроку: кожнае слова лавілася налету, замацоўвалася абгаварвалася. Вось падрабязна і дэтальна разгледжан спосаб барацьбы з контр-рэвалюцыйнай дзейнасьцю служыцелей царкоўнага культу, дадзен напрамак дзейнасьці настаўніка ў гэтай галіне, указана літаратура, расплумачаны спосабы арганізацыі гурткоў бязбожніка і спосабы антырэлігійнага выхаваньня дзяцей. Гэтыя яскравыя і дэтальна тлумачыньні далі настаўніцтву упэўненасьць у сваёй моцы ў барацьбе з рэлігійным дурманам і бадзёры погляд на надыходзячую працу.

Закранута было пытанье аб сродках выхаваньня дзіяці згодна педалёгіі, але можна лічыць, што толькі закранута, бо для вывучэньня гэтага пытаньня патрэбен не малы час. Усё-ж на падставе дадзеных ведаў, пры ўважлівых адносінах к правільнаму выхаваўчаму боку школы, веды таксама магчыма папоўніць згодна дадзеных выпіскі адпаведнай літаратуры.

Праслухалі і досыць уявілі некаторыя веды па прыродазнаўству, але гэты бок вымушае чакаць на будучы час большага, чым ён даў, бо гэта зьяўляецца сталым пытаньнем у сувязі з выкарыстаньнем зямельных пакасальных вучасткаў пры школах, і асабліва ў вязку з дапамогай сялянству парадай.

Што датычыцца выкладаньня мэтодык па арыфмэтыцы і роднай мове, то хоць новых кругавідаў яны не адчынілі, але нельга абыйсьці той равнавіднасьці і нязвычайнай цікавасьці, з якой распрадован спосаб выкладаньня для вучняў школ 1-й ступені.

Праслухалі таксама дэтальна растлумачаны пяцігадовы плян нашага дашкаўнага будаўніцтва, і перад настаўніцтвам шырока разгарнуліся шматгалін, у якіх наша школа павінна дапамагчы выкананьню намечанага пляну, а побач з гэтым узьнікла шмат пытальняў, якія самастойна бывае цяжка вырашыць на месцы, пытальняў балючых, атручваючых настрой, як нявыкананы наказ і непрабудзіўшых тэрміновага вырашэньня. І не дарэмна: яшчэ раз рашуча была падкрэсьлена неабходнасьць сельска-гаспадарчага ўхілу ў школе з мэтай упляву на насельніцтва ў перабудове старай вёскі на новую.

Некалькі слоў аб прыкладным мастацтве ў школе. Ня раз прыходзілася чуць ад нашых паважаных кіраўнікоў курсамі, што школа бяз сьпеваў зьяўляецца як-бы напалову мёртвай. Трэба згадзіцца з такім поглядам, але трэба заўважыць і тое, што зборнікаў беларускіх сьпеваў, асабліва школьнага характару, бадай што няма. Той-жа маленькі матар'ял, які пасьпелі даць курсы, зьяўляецца недастаткова і яго хоціць ня больш, як на 2-3 месяцы.

Папоўніць яго неабходна, і мы чакаем, што адпаведныя кіруючыя органы адгукнуцца на гэта запытанье і не пакінуць нас сярод шляху ў нашых добрых пачынаньнях.

В. Чарнякова.

Бягомль.

ЯК РАЗУМЕЕ ЗАДАЧЫ „АЎТАДОРУ" МЕНСКІ КАМГАС.

Мы больш чым ўпэўнены, што будучы гісторык аўтадорскага руху ў БССР пачэснае месца адвядзе аўтадорскім імкненьням Менскага камгасу, яго заўзятасьці і ўпартасьці ў будаўніцтве дарог, вуліц, мастоў. Яно і ня дзіва, бо Менск—сталіца БССР.

Каб будучаму гісторыку ня трэба было рыцца ў справаздачах і плянах камгасу аб паляпшэньні дабрабыту гораду, мы пастараемся перадаць яму рэальны факт такога будаўніцтва. Зрабілі маленькую экскурсію за горад, каб так сказаць, на практыцы рогі. ... бліжэйшая ў нас да-

Прыгожы ... шпацырую за горадам каля «Антонава».

— Вось—думаю я сабе,—хутка гэта нязграбная і калдобістая дарога будзе выбрукавана, ня будзе тут больш балота; а на роўнядзі яе, як страла, будзе каціць аўтамабіль. Я буду сядзець у ім і злёгка пагушківаць на мяккіх падушках...

Падыходжу бліжэй—аж з боку нібы малатарня гудзе яшчэ, бліжэй—аж ужо не малатарня, а, здаецца аўтабус..

Во, вязюдзе, тут... я толькі што аб табе марыў, а ты, як тая шапканявідзімка зьявіўся ўжо...

Гляджу небарака гудзе вусім не ад радасьці, а проста ня можа выбрацца з ямаў: абапал усяе дарогі, на гасьцінцы, які зварачвае каля хутару «Антонава», накапаны вялізныя ямы (тут капаюць гліну) а дарога лукаткамі ідзе памеж глыбокіх ямін. Тут ня толькі аўтабусу, але і на каню цяжка праехаць.

На крык шофэра—«ратуйце» пазьбягаліся людзі, якія ледзь выратавалі аўтабус.

— Ну, і гаспадары,—заўважыў, засопшыся, змардваны шофэр. — Добра, што гэта прыгода здарылася ўсень, а каб уначы, дык, і касьцей тут не сабраў-бы. Нічага, сказаць, цяжка аб рогу пераканаюць, а камгас і ведаць ня будзе... Вось дык «аўтадор»...

Доўга яшчэ лаяўся разлаваны шофэр, пасылаючы на вусіх «далікатныя» эпітэты на адрасе камгасу.

А нейкі стары дзядзя, які стаяў каля шофэра, ласкава заўважыў яму:

— Маўчы лепш, небарака, і падзякуй богу, што ты жывы застаўся, а пра свае «тадоры» пакінь, а другі раз едзь другой дарогай. Праўда, на 3—4 в. накладней, але гэта глупства і ты будзеш жывы і машына будзе цэлай.

К. І.

СУД.

Злосны растратчык.

Спачатку 1926 году Алесь Алесяў Сеўрук быў абраны ў склад праўленьня Менскага акруговага саюзу паляўнічых.

Пры разьмеркаваньні абавязкаў памiж членамі праўленьня—Сеўрук застаўся адказным сэкратаром і касірам паказнага саюзу.

Прыняўшы касу, Сеўрук запрацаваў. Атрымліваючы ад членаў саюзу членскія і іншыя ўзносы, Сеўрук меў прывычку класьці ўзносы не ў грашовую скрыньку, а ў сваю кішэню, а калі грошы нападалі ў кішэню, Сеўрук не шкадаваў іх, пускаў направа і налева на разгулы, пакупку рэчаў для уласных патрэб і г. д.

Ужо к восені 1926 году Сеўрук растраціў 300 р., але калі падлічылі касу і старшыня праўленьня Мілер упэўніўся ў растраце,—крымінальнай справы супроць Сеўрука не распачаў, а загадаў яму папоўніць растрату в пэнсіі частковымі ўзносамі.

У кастрычніку месяцы 1927 году, калі рэвізійная камісія высунула пленуму праўленьня прапанову правесьці ў жыцьцё гарантыйнае страхаваньне супрацоўнікаў—служба якіх зьвязана з грашовымі справамі, пленум на гэта згадзіўся, але праўленьне пастанову пленуму ня выканала і Сеўрук заместа папаўненьня ранейшага недахопу, за якім ніхто не сачыў, працягваў злоўжываць і вытвараць растраты саюзных грошай на свае асабістыя патрэбы. Адначасова Сеўрук зацягваў грашовую справаздачу па некалькі месяцаў і нагул, забытваў рахункаводства з мэтай захаваць сьляды растраты.

Толькі ў маі месяцы 1928 году была зроблена генэральная рэвізія і за Сеўрукам была выяўлена растрата 3567 р. 83 кап.

Менскі акруговы суд прыгавару: Алеся Алесевага Сеўрука на пяць год выпраўленьня з суровым адмежаваньнем, пазбаўленьнем у правох на два гады і спагнаньнем з Сеўрука на карысьць Менскага акруговага саюзу паляўнічых 3567 р. 83 к.

Кастроў.

Апавяшчэньне.

САД АСЬВЕТЫ.

— Сёньня, 1 жніўня,—кіно «Сумка дзіцяці».

Пачатак роўна ў 10 гадзін.

Білеты сябрам яшчэ—10 кап., сябрам саюзу—15 кап.

У выпадку дрэннага надвор'я кіно пераносіцца ў Дом Асьветы.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ТЭАТР—КІНО.

ЛЕТНІ САД КІНО «КУЛЬТУРА». Савецкая, 71.	Мастацкі фільм „ЗЯЛЁНЫ ШУМ". ЗВЫШ ПРАГРАМЫ ГАСТРОЛІ МАР'І ДАНСКОЙ са сваімі сэнсацыйнымі нумарамі.
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	З аўторка 31 ліпеня пасьля доўгага перапынку зноў на нашым экране папулярная акторка МАР'Я ЯКОВІНІ ў фільму „У ПЛЫВУЧЫМ ДОМЕ". Драма ў 7 частках.
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	ТОЛЬКІ 3 ДНІ. ГРАНДЫЁЗНЫ ФІЛЬМ. „ГІШПАНСКАЯ ТАНЦОРКА" у 8 частках. Каса адчынена в 5 г. Пач. 1-га сэансу а 7 гадз. 30 хв.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	У ЗЬВЯЗКУ З РАМОНТАМ, ЗАЧЫНЕНА ДА 7 ЖНІЎНЯ.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА.
ВЫШЛА З ДРУКУ
і прадаецца ва ўсіх кнігарнях БДВ
П. Лепяшынскі.—Ля вытокаў бальшавізму,—да
— 25-годзьдзя II-га зьезду партыі. —
ЗЬМЕСТ: У якой гістарычнай абстаноўцы падрыхтаваўся II зьезд. Старая «Искра» на рабоце па падрыхтоўцы да II зьезду. Першая палова зьезду. Бунт зьездаўскай апартуністычнай кааліцыі супроць ленінізму. Гістарычная роля і значэньне II зьезду ў жыцьці партыі.
Старонак 64, цана 15 кап.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Пасьведчаньне Дзяніcевіча С., выд. Менакрстрахкасай, кв. 909.

— Ордэр на атрыманьне грошай у суме 5 р. 75 к. Цімошэнка І. А., выд. Калінкаўскім вучасткам Лесбелу за № 17065, кв. 916.

БАЛЯНС

Беларускага Сельска-Гаспадарчага Банку на 1-га ліпеня 1928 году.

Каса і бягучыя рахункі	521877-89	Асноўны капітал	4073244-37
Каштоўнасьці	4-77	Іншыя ўласныя капіталы і фонды	721024-54
Дысконт і спэц. бяг. рахункі над вэксалі	2167215-72	Старонныя сродкі для мэтав. крэдытаваньня	8164427-23
Тавара-пазычковыя апэрацыі	963797-10	Пазыкі ўнутры сыстэмы с.-г. крэдыту	8554528-42
Мэтавыя пазыкі	21794391-41	Перадысконт і перазаклад	2703135-57
Пратэрмінованыя пазыкі	21656-11	Укладны і бягучыя рахункі	1405480-28
Розныя дэбіторы	76733-44	Сума да патрабаваньня	6352-60
Маемасьць і ўдзел у прадпрыёмствах	967075-05	Карэспандэнцкія рахункі	82036-36
Выдаткі наступных гадоў	9847-44	Розныя крэдыторы	305536-14
Апэрацыйныя выдаткі бягучага году	339611-28	%%% і прыбыткі наступн. гадоў	25523-51
Адміністрацыйныя выдаткі бяг. году	47402-40	Апэрацыйныя прыбыткі бягучага году	744443-25
		Неразьмеркаваны прыбытак 1926-27 г.	123880-34
БАЛЯНС	26909612-61	БАЛЯНС	26909612-61

Нам. старшыні праўленьня Белсельбанку МАТУСЭВІЧ.
Член праўленьня ТРАФІМАЎ.
Галоўны бухгальтар ДАШКЕВІЧ.

Галоўлітбел 302.